Cana 10 hr.

Hety Nr. „Bieł. Krynicy“ z dadatkam „Praleski“.
Pierasyłka apłačana ryčałtam

Nr. 31 (672). **Wilnia, Aŭtorak 30 Červienia 1936h.** **Hod XII (XX)**

БЕЛАРУСКАЯ КРЫНІЦА | BIEŁARUSKAJA KRYNICA

Palityčnaja, hramadzkaja i litaraturnaja hazeta.

Adras Redakcyi i Administracyi: WILNIA, ZAWALNAJA 1—1 (Wilno, Zawalna 1—1). Redakcyja adčyniena ad 9 hadz. ran. da 4-aj uwieč.	HAZETA WYCHODZIĆ RAZ U TYDZIEŃ.	Košty wydawańnia pakrywajuć składki. Składka u hod 4 zał., na paŭhoda — 2 zał., na 3 miesiacy — 1 zał.

Сябром Беларускага Народнага Аб'еднаньня, усяму беларускаму грамадзянству і агулам да публічнага ведама.

Камунікат № 5.

У сувязі з апошнімі падзеямі на фронце міжнародным, далей у сувязі з ажыўленьнем палітычным у межах Польшчы, Прэзыдыюм ЦК — БНА пастанавіў склікаць поўны ЦК-т, каб у большай колькасьці людзей абгаварыць задачы нашае беларускае палітыкі на сяньня і на бліжэйшую будучыню.

Некаторыя пункты з пратаколу паседжаньня ЦК—БНА з дня 16.VI. сёл. зьмяшчаем ніжэй:

I.

«1. Увесь сьвет перажывае цяпер напружаную пару: усюды адбываецца пераацэнка палітычных і соцыяльных вартасьцяў, усюды заўважваецца імкненьне да новага жыцьця, усюды адбываецца барацьба за лепшы быт.

2. Міжнародная палітыка, абапёртая на імпэрыялізьме, апынулася ў Эўропе ў руках некалькіх вялікіх дзяржаў, якія ўсюды праводзяць свае імпэрыялістычныя мэты, зусім не рахуючыся з недзяржаўнымі народамі і не шануючы прыроднага права на іхняе нацыянальнае жыцьцё, накідаючы ім сваю ўладу і культуру.

3. У жыцьці эканамічна-соцыяльным капіталізм — у форме супалак капіталу індывідуальнага і ў форме агульна-дзяржаўнага — імкнецца заўладаць працоўнымі масамі і прадыктаваць ім сваю волю.

4. У паасобных краінах Эўропы імпэрыялісты з капіталістымі твораць гэтак званыя фашыстаўскія партыі і, захапіўшы ўладу ў дзяржаве, праводзяць свае пляны ў кірунку паняволеньня слабейшых і недзяржаўных народаў, а так-жа паняволеньня працоўных масаў.

5. Супроць імпэрыялістычных імкненьняў фашызму паўстаюць у паасобных дзяржавах саюзы дэмократычных, радыкальных і соцыялістычных партыяў, творачыя гэтак званы „народны анты-фашыстоўскі фронт“; паўстаюць так-жа і саюзы дзяржаў супроць імпэрыялістычнага захопніцтва азброенага фашызму.

6. Гэтыя змаганьні варожых між сабою сіл выклікаюць напружанасьць у міжнароднай палітыцы, якая датычыць пасрэдна і беспасрэдна так-жа і палажэньня Беларускага народу, які хочучы, ці ня хочучы, можа стацца прадметам торгу і захопніцтва імпэрыялістычных кругоў.

II.

7. Бяручы пад увагу вышэй сказанае, ЦК—БНА, прызнаючы дасюлешнюю палітыку, праводжаную Прэзыдыюмам ЦК—БНА правільнай і адпавядаючай сучаснасьці, у гэты гістарычны час дае наказ свайму выканаўчаму органу, Прэзыдыюму ЦК—БНА, зорка сьледзячы за палітычнымі падзеямі ў Эўропе, а так-жа і ў суседніх народаў, высьцерагацца тых палітычных сілаў, што нясуць Беларускаму народу такую, ці іншую, няволю і эксплёатацыю, трымацца сваей самастойнай ідэолёгіі і рэалізаваць яе згодна са сваей праграмай, супрацоўнічаючы з дэмократыяй украінскай і літоўскай, а так-жа дэмократыяй іншых народаў, якая спагадае ідэі поўнага вызваленьня і самаазначэньня Беларускага народу.

8. БНА — арганізацыя дэмократычная і дзеля гэтага мы па той старане лініі фронту, дзеляча га чалавецтва на дзьве часткі, дзе няма зьдзеку, дзе няма выкарыстоўваньня ані фізычнага, ані духовага, дзе ёсьць прынцып справядлівасьці, свабоды. Ясна, што мы праціў усякай дыктатуры, каторая нясе няволю народам, працоўным масам і адзінкам.

9. ЦК—БНА падчырквае, што разумее вельмі добра ўсю важнасьць праблемы „народнага фронту“. Што датыча аднак канкрэтных формаў „народнага антыфашыстаўскага фронту“, палітыка БНА павінна трымацца свайго дасюлешняга становішча і далей, адносячыся да яго ўстрымана і крытычна, але об'ектыўна, пакуль „народны фронт“ ня выявіць канкрэтна сваей палітычнай плятформы і ня выкажа свайго становішча адносна недзяржаўных народаў, а ў іх ліку і народу Беларускага.

10. ЦК—БНА сьцьвярджае, што палажэньне беларусаў ўсюды цяжкое, за апошнія часы на лепшае не перамянілася і што дамаганьні арганізаванага беларускага грамадзянства, выяўленыя ў рэзалюцыях зьездаў і сходаў беларускіх арганізацыяў у мінулых гадох, не здаволены

11. Дзеля гэтага ЦК—БНА дамагаецца ад польскіх уладаў:

a) правядзеньня такой зямельнай рэформы на тэрыторыі Польскай рэспублікі, заселенай беларусамі, пры каторай былі-б надзеленымі да поўназямельля і беззямельныя і малазямельныя беларускія сяляне;

b) адчыненьня на гэтых тэрыторыях здавальняючае колькасьці беларускіх пачаткавых, сярэдніх агульных і фаховых школаў і ўнівэрсытэту;

c) у галіне зашкольнай асьветы — свабоднага разьвіцьця для беларускіх культурна-асьветных і эканамічна-гаспадарчых установаў;

d) агулам — поўнае рэалізацыі ўсіх правоў, якія належацца беларусам на падставе аснаўных законаў Польскай рэспублікі і прыроднага права Беларускага народу на існаваньне як асобнай нацыі.

12. ЦК—БНА — за поўную амнэстыю для палітычных праступнікаў, зварачваючы грамадзкую ўвагу на патрэбу такой-жа амнэстыі ў СССР. а так-жа за забясьпечаньне палітычных, эканамічных і нацыянальна-культурных інтарэсаў беларускага народу на ўсіх яго этнаграфічных землях, разумеючы беларускасьць нацыянальна-культурных інтарэсаў у СССР ня толькі ў форме, але і ў зьмесьце.

III.

13. ЦК—БНА сьвярджае патрэбу сяньня, больш як калі, узмоцненага кантакту з шырокімі гушчамі беларускага сялянства і работніцтва. Дзеля гэтага ЦК—БНА пастанаўляе праводзіць гэта праз прэсу, асабісты кантакт, зьезды і г. д.

14. БНА, згодна са сваей праграмай, будзе весьці палітыку агульна-народную, імкнучыся да свайго найвышэйшага ідэалу, сфармулованага ў праграме.

15. ЦК—БНА заклікае сяброў арганізацыі, прыхільнікаў ды агулам усё шчыра патрыятычнае беларускае грамадзянства згусьціць рады, трымацца сваіх дазнаных людзей, учытывацца ў сваю прэсу.»

ПРЭЗЫДЫЮМ Ц. К-ТУ БЕЛ. НАРОДН. АБ'ЕДНАНЬНЯ

(—) *Я. Пазьняк* — Старшыня
(—) *Др. Ст. Грынкевіч* — І-шы Віцэ-Старшыня
(—) *М. Дварэцкі* — ІІ-гі Віцэ-Старшыня
(—) *Інж. А. Клімовіч* — Скарбнік.
(—) *Я. Найдзюк* — Сакратар.

Вільня, 16.VI.1936 г.

БІГіК і ТБШ павінны аб'яднацца

Ведама кожнаму, што многа добрага можа зрабіць чалавек-адзінка, калі ён належна разаўе і выкарыстае ўсе свае духовыя сілы. І калі яму пачаць «памагаць» з боку, накідаючы яго асабістасьці чужыя яму свомасьці, дык замест падмогі і карысьці, будзе перашкода і шкода. Тое-ж самае трэба сказаць і аб кожнай ідэовай арганізацыі. І тут, калі ў яе ўводзіць нешта чужое ёй і нязгоднае з яе мэтамі і накіраваньнямі, дык праца такой арганізацыі нятолькі не разаўецца, але спыніцца і можа нават цалком разваліцца. Справа ў тым, што як чалавек-адзінка, так і адзінка грамадзкая, каб належна разьвіваліся і працавалі, дык мусяць апірацца прадусім на сваей асабістай ці грамадзкай індывідуальнасьці, датарноўваючыся аднача сна да такіх-жа адзінак іншых, але сваяцкіх сабе, або іх мінаючы мімаходам, ці на'т борачыся з імі, калі яны чужыя і варожыя.

Гэта праўда, бо такім сапраўды ёсьць наша жыцьцё. І калі чалавецтва з прадвякоў знае пагаворку — у еднасьці сіла, дык праз яе так-жа гэту, а ня іншую выражае праўду. Сутнасьць гэтай пагаворкі ў тым, што кожная індывідуальнасьць павінна з аднаго боку разьвівацца на падставе сваей прыроды, а з другога боку павінна так-жа з адпаведнымі, сваяцкімі сабе індывідуальнасьцямі злучацца, аб'еднывацца, каб больш «поўнакроўна», больш сільна й пэўна разьвівацца, працаваць, тварыць, ісьці да мэты.

Ясная рэч, што ўсё гэта стасуецца так-жа й да беларускага грамадзкага жыцьця, у якім справа гэта выглядае ў некаторых галінах прынамсі ненайгорш, а ў некаторых яўна нядобра. У палітыцы роль індывідуальна-аб'еднываючую іграе Бел. Нар. Аб'еднаньне. Працу сваю яно праводзіць рачова і консэквэнтна, разьвіваючы беларускую дэмократычна-незалежніцкую, вынікаючую з акту 25.III.18, ідэолёгію. Вынікі гэткай працы БНА, як на беларускія варункі, трэба ацэніваць цалком позытыўна. Паза БНА, існуе так-жа паважная палітычная група, што арганізуецца каля газ. «Наша Воля» і што так-жа мае аб'яднаўчы характар на прынцыпе прадусім соцыяльным. У галіне літаратуры й навукі роль аб'яднаўчую поўніць «Калосьсе», у жыцьці нацыянальна-грамадзкім моладзі — «Шлях Моладзі», для беларусаў-каталікоў «Chr. Dumka» (астаецца толькі пажадаць, каб нешта падобнае паўстала ў беларусаў праваслаўных). А вось у галіне школьнай і пазашкольнай асьветы справа скоордынаванай працы ў беларусаў выглядае, здаецца, найгорш.

Маем на ўвазе існаваньне ў нас дзьвёх культурна-прасьветных арганізацыяў БІГіК і ТБШ. Мэты і ідэовы характар гэтых беларускіх арганізацыяў аднолькавы, можа толькі статутовыя рамкі аднэй шырэйшыя (БІГіК мае ў статуце так-жа й справы эканамічна-гандлёвыя), а другой вузейшыя. Калі да гэтага ўзяць яшчэ пад увагу тое, што ў беларусаў адчуваецца недахват культурных працаўнікоў, а так-жа тыя варункі, у якіх наша народная асьвета знаходзіцца, дык выходзіць, што БІГіК і ТБШ гэта не індывідуальна самастойныя арганізацыі, якіх злучыць у вадно ня можна, а можна толькі коордынаваць іх працу, але што гэта конкурэнцыйныя аднаго ідэовага характару арганізацыі, што так быць не павінна і што яны павінны пашукаць дарогі да аб'еднаньня пад клічам: супольнымі сіламі да супольнай мэты.

Практыка сёлетняга году паказала, што калі ня поўнае

24036+

аб'еднаньне між БІГіК і ТБШ, дык прынамсі поўнае скоордынаваньне сіл зусім магчымае. Беларускі школьны супольны фронт ёсьць нязьбітым гэтага доказам.

Факт коордынаваньня беларускай працы на школьным фронце ёсьць так-жа доказам і таго, што такі супольны фронт можна дакапаць. Паводле дадзеных Сакратарыяту школьнага фронту беларускай вёсцы на яе запатрэбаваньне дагэтуль выслана і выдана: дэклярацыяў — 27.171, заяваў — 1259, інструкцыяў — 1.205, адозваў да народу — 677. Словам, зроблена работа вялікая. А ці-ж гэта работа была-б зроблена, калі-б БІГіК і ТБШ рабілі яе паасобку і, ясная рэч, пры гэтым конкуравалі? Пытаньне гэта яснае і адказу не патрабуе, ды яно было-б яшчэ ясьнейшым, калі-б ішла гутарка аб аднэй, аб'яднанай арганізацыі. Пры гэтым незабывайма, што па сканчэньні акцыі школьнай — бяз увагі на яе вынік дзеля прычын вонкавых — трэба будзе далей думаць аб асьвеце беларускага народу пазашкольнай.

Мы ўважаем, што БІГіК і ТБШ пасьля дадатных вынікаў з прычыны іх часовага коордынаваньня працы, павінны падумаць аб сталай ня то' што коордынацыі, але — кажам ясна і адкрыта — аб злучэньні, аб аб'еднаньні.

А як гэта зрабіць? Пытаньне гэта датыча тэхнікі і яго беспасрэдна павінны разважыць зацікаўленыя як з аднаго, так і з другога боку. Мы тут выказваемся толькі прынцыпова.

Бацькі Беларусы! Вучэце сваіх дзетак беларускае граматы! Дамагайцеся роднае беларускае школы!

Z hazet.

Ci jość praletarjat u SSSR?

Wiedamy ekanamist — balšawik W. Milutin u žurnale „Socialističeskaja Rekonstrukcija" i adzin z blizkich supracoŭnikaŭ Stalina Stecki ŭ „Komsomolskoj Prawdzie" paddajuć razhladu pytańnie, ci jość u SSSR praletarjat? Hetyja kamunistyčnyja dziejačy dakazwajuć:

„Pad praletarjatam zaŭsiody razumieli eksploatawanuju klasu najmitaŭ kapitalistyčnaha hramadzianstwa". U SSSR kapitalistyčnaja hramadzkaść źniščana. Eksploatawanaj klasy nie pawinna być. Pracoŭnaja klasa, zachapiŭšy ŭładu i zaćwierdziŭšy swaju dyktaturu, užo nie źjaŭlajecca praletarjatam u papiarednim razumieńni henaha słowa, „jon źniščyŭ sam sabie, jak praletarskuju klasu". Dziela hetaha i wyražeńnie „dyktatura praletaryjatu" jość užo ŭstarełaj frazaj. Ale i wyražeńnie „dyktatura rabotnickaj klasy" taksama nie adpawiadaje. Nie zważajučy, što rabotniki stanowiać awanhardu nasielnictwa, ale SSSR — dziaržawa ŭsich pracujučych, u jakoj ustanaŭlajecca roŭnapraŭnaść rabotnikaŭ i sialan.

Słowam, nowyja filozafičnyja wywady, jakija paćwiardžajuć, što dasiul jašče sialanie ŭ SSSR nia byli roŭnapraŭnymi z rabotnikami. A jak heta budzie adsiul — pabačym.

Prywatnaja ŭłasnaść SSSR.

Na hetaje pytańnie adkazwaje niechta Pašukanis u „Prawdie". Socyjalizm, pawodle słoŭ aŭtara, naŭpierad adkrywaje dla kožnaha hramadzianina mahčymaść karystacca zdabyčami nawuki, industryi, techniki, ŭ tym liku šlacham pawialičeńnia bahaćcia, jakoje pierachodzić u indywidualnaje karystańnie i na ŭłasnaść siabry socyjalistyčnaha kolektywu. Acharaniajučy socyjalistyčnuju ŭłasnaść, jak sposab wytworstwa, socyjalistyčnaja dziaržawa taksama ćwiorda acharaniaje zapracawanuju majemaść, dachody z pracy, damy, paasobnyja haspadarki, pryłady prywatnaj patreby i nieabchodnyja pryłady pracujučaha. Užo ciapier niaredka možna spatkać, prykładam, aŭtamabili, jakija stanowiać prywatnuju ŭłasnaść rabotnikaŭ i słužačych. Nowaja kanstytucyja dapuskaje isnawańnie drobnaj pracoŭnaj ułasnašci indywidualnaj.

„Socyjalizm, — piša aŭtar, pradstaŭlaŭsia jak ład, pry jakim čaławiekadzinka addajecca ŭ achwiaru kolektyŭnamu Mołochu. Hetyja hłupyja baśni chiba ŭžo nia zmohuć kaho kolečy źbić z tołku".

Hetak ŭžo tłumačać balšawickija dziejačy socyjalizm i, jak widać, nachilajuć swajo tłumačeńnie da pryznańnia drobnaj prywatnaj ułasnašci i woli čaławieka-adzinki. Jak heta budzie prajaŭlacca ŭ praktycy—pabačym.

„Новая Искра".

Ci ŭ Francyi budzie kamunizm?

Paśla abniaćcia dziaržaŭnaj ułady ŭ Francyi „narodnym frontam", buržuazna-fašystaŭskaja presa ŭderyła trywohu, što tam nastali časy „kieranščyny" i, što tam chutka zapanuje kamunizm. Ab losie Francyi pačali biadawać nawat i niekatoryja biełarusy. Dziela taho, što hetyja „francuskija patryjoty" sučasnaje nutranoje francuskaje pałažeńnie raŭniajuć z pałažeńniem Rasiei ŭ 1917 h., nazywajučy jaho „francuskaj kieranščynaj," u hetaj sprawie adazwaŭsia samy nastajaščy Kierenski, jaki prabywaje ŭ Francyi, i ŭsim dalokim i blizkim „francuskim patryjotam" zajaŭlaje praz hazetu nastupnaje:

„Niama najmienšaj padobnaści miž ciapierašnim pałažeńniem u Francyi z pałažeńniem u Rasiei ŭ 1917 h. Indywidualizm francuzaŭ i hramadzkija warunki ŭ Francyi wyklučajuć prychod kamunizmu ŭ hetaj krainie".

Pry hetym adznačajem, što indywidualizm biełarusaŭ tak-ža wyklučaje kamunizm, dyk zamiest haławicca ab „upadku" francuzaŭ, radzim biełaruskim „francuskim patryjotam" źwiarnuć bolš uwahi na warunki sučasnaha žyćcia biełarusaŭ, kab ich pieratwaryć na takija, jakija wyklučali-b kamunizm.

p—k.

З БЕЛАРУСКАГА ЖЫЦЬЦЯ

Суды: — 26.VI. сёл. адбылася ў Віленскім Акружным Судзе судовая расправа над рэд Я. Пазьняком за надрукаваную ў „Бел. Крыніцы" ў № 21 з 1935 г. карэспандэнцыю з Шэрэшава, Пружанскага пав. У выніку расправы грам. Пазьняк засуджаны на 2 месяцы арышту, з завяшаньнем выкананьня на 2 гады, і на 100 зл. штрафу, а так-жа прысуджана заплаціць судовыя кошты.

— 18.VI. сёл. у Віленскім Гарадзкім Судзе адбылася судовая расправа над рэд. „Новага Шляху," Ул. Казлоўскім у справе сканфіскаванага нумару гэтай газэты. Суд. рэд. Казлоўскага засудзіў на 1 месяц арышту і на 50 зл. штрафу, а так-жа і на заплату судовых коштаў.

Падаецца да ведама, што зборкі дзеля чысьціні беларускай мовы на летні час спынены і пачнуцца ў м-цы верасьні. Аб пачатку гэтых зборак будзе своечасна паведамлена.

Z litoŭskaha žyćcia

Ab kooperacyi ŭ Litwie. Niadaŭna Instytut Ekanomii Ziemlarobskaj U.S.B. wydaŭ drukam pracu inž. M. Krauźlisa ab kooperacyi ŭ Litwie. (Wilnia, 1936 h. bač. 115).

Hetaja praca inž. M. Krauźlisa składajecca z raździełaŭ: 1) ahulnaje paznańnie Litwy, 2) haspadarčaje žyćcio Litwy, 3) kooperatyŭny ruch u Litwie prad suświetnaj wajnoj, 4) kooperatyŭny ruch u niezaležnaj Litwie, 5) raźwićcio i dziejnaść kooperacyi.

Z hetaj pracy inž. M. Krauźlisa dawiedwajemsia, što kooperacyja ŭ Litwie šyroka raźwita i abymaje hetkija haliny: — kooperacyja kredytowaja, kooperacyja spažywieckaja, kooperacyja ziemlarobska - handlowaja i małačarskaja.

Ahułam — praca inž. Krauźlisa wykazwaje šyrokaje raźwićcio kooperacyi ŭ Litwie.

Z nutranoj polskaj palityki

Paśla źmieny ŭradu atmasfera wyčuwańnia achapiła ŭsiu Polšč. Što padhataŭlaje ŭrad, jakimi šlachami dumaje jści — źjaŭlajecca jašče ŭsio temaj dahadak. Paśla prahramowaj pramowy premjera Sławoj-Składkoŭskaha, jakaja ničoha kankretna nia wyjaśniła, skazaŭ takuju-ž pramowu ŭ minułym tydni ŭ sojmawaj kamisii wice-premjer Kwiatkoŭski, jaki hawaryŭ ab haspadarčaj prahramie ŭradu. Wice-premjer, jaki jość adnačasna i ministram skarbu, zajawiŭ, što ŭrad budzie rašuča zmahacca z biezraboćciem, budzie wieści palityku ŭzmacawańnia pradukcyjnych siłaŭ, apirajučysia na swajej nutranoj wytworčaści i konsumcyi, budzie trymacca roŭnawahi dziaržaŭnaha budžetu i budzie kirawacca ŭ finansawaj palitycy stabilizacyi polskaj waluty. Plan haspadarčaha padwyšeńnia Polščy maje palahać na inwestycyjach, h. zn. na dapamozie dziaržaŭnych kapitałaŭ dla pradukcyi i hramadzkich rabotaŭ. Dziela prawiadzieńnia hetaha inwestycyjnaha planu ŭrad zaściarahaje sabie 4 hady času. Pryhetym maje być raśpisana nutranaja inwestycyjnaja pazyčka na sumu 200—300 miljonaŭ zł. Apračа wyšej pieraličanaha, urad zaklikaje ŭsio nasielnictwa Polščy na front abarony dziaržawy.

Woś i ŭsio, ab čym dawiedałasia polskaje hramadzianstwa ab haspadarčaj budučyni Polščy. Wiedama, što maje być toje i druhoje zroblena, ale jak?... hetaha dawiedacca z pramowaŭ premjera i wice-premjera ŭradu trudna. Adna polskaja hazeta ab haspa-

Міхась Машара.

Лёгкі хлеб.

9)

Драма ў трох актах, з жыцьця вясковай моладзі.

Зьява 12-я.

Тыя-ж бяз Верачкі.

Васіль — Вось здарэньне! Ці думаў ты, Пятрусь, ідучы сюды, што спаткаеш Верачку?

Пятрусь — А яна таксама прыгожа... толькі мізэрней выглядае.

Васіль — І, як бачу, таксама табе падабаецца.

Пятрусь — Кінь жарты, Васіль!

Васіль — І ня думаў! Я адно толькі добрае заўважыў, — гаворыць пасвойму. І ў месьце. Зьмяніцца ў гэты бок?—гэта добрым варожыць.

Пятрусь — Яна заўсёды была добрай, толькі яе нядобра разумелі.

Васіль — Ну выбач! у вёсцы яна гаварыла паруску і пагляды мела панскія.

Пятрусь — Рэч ня ў гутарцы... І ў паглядах не яе была віна... Але якім парадкам яна тут? І дзе-ж той пракляты Крук?

Васіль — На Круку пэўна вешаецца другая. Гэта пэўна яго рамясло шукаць і красьці багатых дзяўчат з вёскі, але не жаніцца.

Пятрусь — А ты ўсё свае жарты!

Васіль — З радасьці, братка, з радасьці! Чуе штось сэрца (*уходзіць Верачка*).

Зьява 13-я.

Тыя-ж і Верачка.

Верачка — Ну, цяпер магу з вамі гаварыць. Гаспадар даў волю аж да вечара.

Васіль — (*поўжартам*) Шкада, што не назаўсёды! Але сядайце, калі ласка!

Верачка — (*сядаючы*) Што вы гаварыце! Як бы я жыла? Ведаеце хіба, як цяпер цяжка дастаць працу? А тут мне даволі добра і спакойна.

Васіль — Даруйце! Добра ведаю; амаль сам не застаўся бяз працы.

Верачка — (*Да Пятруся*) Ну, раскажыце, што дзеялася і што дзеіцца ў нас там у вёсцы? Я так рада, што спаткала вас! Мне так хочацца даведацца аб усім!

Пятрусь — Што казаць? Амаль усё пастарому. Зьмен большых няма. Вёска жыве памаленьку.

Васіль — Вы мне выбачце, я на пара мінут пакіну вас.

Пятрусь — А куды ты?

Васіль — Тут недалёчка нашая коопэратыва, дык я зраблю сякія-такія пакупкі. Панна Вера мае сяньня вольны час, дык пасьля пойдзем да мяне? Ганулька недзе адна, а навошта ж яе пазбаўляць прыемнасьці, пабачацца з вамі? Дык выбачайце. (*выходзіць*).

Зьява 14-я.

Тыя-ж без Васіля.

Верачка — Дык, расказвайце, Пятрусь! Пра бацькоў маіх раскажыце! Пра маму, пэўна вельмі плача бедная?

Пятрусь — Так... Плача... І бацька сумуе. Пастарэлі абое значна.

Верачка — Бедныя!

Пятрусь — Ня добрая вы Вера! Жывеце вось тут і хоць-бы слоўка бацьком! А яны вас так кахаюць! Калі не зайдзеш да іх, толькі і гутарка, што аб вас, а вы ні слоўка. Але цяпер, як прыеду і раскажу, што бачыў вас, во будзе радасьці!

Верачка — Не, не! вы не кажыце, што бачылі мяне!

Пятрусь — Чаму? Яны так рады будуць!

Верачка — Праўда, Пятрусь, я надта нядобрая, я надта злая дачка. Гэта доўгая рэч, расказаць усё. Вось вы пытаецеся, чаму ня пісала аб сабе дамоў? Гэтага, памойму ня трэба... Толькі мне хочацца, каб вы зразумелі крыху мяне і ня судзілі так жорстка.

Пятрусь — Кіньце! Што вы! Я добра вас разумею і ня думаю нічога благога. Што-ж? Гэта зусім зразумела—вы кахалі! І зусім ня трэба аб гэтым, калі вам няпрыемна.

Верачка — Не, здаецца, якраз вы мяне не разумееце. Я хацела сказаць вам не аб тым. Гэнае ўжо мінула... перажылося і даўно прайшло. Але аб бацькох. Я страшна нядобрай была для іх. Яны так кахалі мяне, хоць я зусім няварта была гэтага. Я зразумела гэта ўжо потым і гэта мяне моцна мучае. Вось дзеля чаго і ня пісала ім аб сабе. Я для іх памёрла! Яны моцна цярпелі, страціўшы мяне, але неяк ужо пагадзіліся са сваім лёсам... і пісаць... Зноў крануць незагоенныя раны баялася. Мучылася гэтым моцна, але маўчала.

Пятрусь — Верачка! панна Вера!

Верачка — Кіньце, Пятрусь! вы ўсё ведаеце, будзем шчырымі... якая я там „панна." Завіце мяне проста Веркай!

Пятрусь — Верачка ты для мяне ўсьцяж тая самая! Як калісь! Як даўней!

Верачка — Шчыра табе ўдзячна, Пятрусь!

Пятрусь — (*падходзіць бліжэй да яе*) Як я рады, што спаткаў цябе тут! Як я сумаваў, нічога ня ведаючы аб табе! Каб ведаў, што ты шчасьлівая, здаецца, не балела-б так сэрца.

Верачка — Пятрусь!

Пятрусь — Ня бойся, я не абражу цябе! Я толькі хачу сказаць, што я ўсьцяж моцна і шчыра кахаю цябе!

Мне толькі хочацца пагаварыць з табой! Каб хоць крыху стала лягчэй на сэрцы. Бо і я так многа перацерпеў. Моўчкі, безнадзейна і балюча!

Верачка — Кінь, Пятрусёк! Я ня варта твайго пачуцьця. Мінулага ня вернеш! Што

darčaj pramowie wice-premjera piša:— plan jość pоŭny tajnaści — jon maje ŭ sabie supiarečnaści, da jakich pryznaŭsia i sam wice-premjer, zajaŭlajučy, što „dobraja raźwiazka aktualnych haspadarčych prablemaŭ napatykaje ŭ niekatorych elementach na ŭzajemnyja supiarečnaści."

Astajecca ciarpialiwaje i spakojnaje čakańnie.

Ukrainska (UNDO) — polskija suadnosiny.

Premjer nowaha polskaha ŭradu hien. Sławoj-Składkoŭski ŭ swajej palityčnaj pramowie nie zakranaŭ prablemy niapolskich narodaŭ u dziaržawie, moŭčki abminuŭ taksama i Ukraincaŭ. Hetkaje pramaŭčańnie ŭkrainskaj sprawy, paśla zaklučeńnia miž UNDO i b. ministram nutranych spraŭ Kaściałkoŭskim ukrainska-polskaj uhody, pierad wybarami ŭ Sojm i Senat u 1935 h., zmusiła ukrainskuju presu da pierahladu polska-ukrainskich suadnosinaŭ. Ukrainskaja hazeta *„Волинська Нэділя"* u Nr. 24, z 21.VI. 1936 h. ab hetym piša tak:

— Užo minaje hod ad h. zw. normalizacyjnych zajawaŭ, ale dzieławoha ździejśnieńnia hetaj normalizacyi z polskaha boku nia widać. Widać jano tolki z ukrainskaha boku, dzie UNDO pierałamała ahulny apazycyjny front da ŭradu ŭ ukrainskaj masie i wytwaryła kampramisowyja da jaho nastroi:

I bačyma cikawuju prajawu — henyja nastroi ciapierašni ŭrad abminaje i ŭ taki čas, kali z druhoha boku zaklikaje ŭsio nasielnictwa Polščy na front „abarony dziaržawy." Dachodzić da taho, što premjer Składkoŭski ŭ swajej prahramowaj pramowie ahułam abchodzić moŭčki isnawańnie inšych nacyjanalnaściaŭ u Polščy, jakich jość 10 miljonaŭ! —

Ah hetym hawaryŭ u minułym tydni na zasiadańni sojmawaj kamisii staršynia UNDO i Ukrainskaj Parlamantarnaj Reprezentacyi pasoł W. Mudryj. Pramowa była wytrymana i spakojnaja, ale ściwiardžała, što: wialikija zmahańni UNDO u sprawie normalizacyi nie znajšli z polskaha boku ni adpawiednaha zrazumieńnia, ni padtrymańnia. Naadwarot, ćwierdziŭ pas. Mudryj, što „adnosiny miascowaj ułady da Ukraincaŭ na našych zach. ziemlach u niekatorych miascoch nawat pahoršylisia (tut padaŭ pramoŭca fakty) "

Dalej *„Вол. Нэділя"* pieradaje pramowu pasła Mudryja hetak — „Ukrainski 6-miljonny narod nia moža być na wialikaj terytoryi ŭsio tolki abjektam palityki," kančajučy swaju pramowu, pas. Mudryj damahaŭsia ad uradu raz užo mienš abiacanak, a bolš dzieła.

Hetak wyhladaje, pawodle pramowy pasła Mudryja i aświatleńnia ŭkrainskaj, blizkaj da UNDO, hazety „B. H.," polska-ukrainskija suadnosiny paśla zaklučeńnia ŭhody.

Likwidacyja abisynskaj sprawy ŭ Eŭropie

Eŭrapejskija dziaržawy, zarhanizawanyja ŭ Lizie Narodaŭ, ŭściaž hawaryli i haworać ab suświetnym miry i tworać pakty ab nienapadańni adny na druhich, a pry hetym wykazwajuć swaju „dobruju wolu" baraćby suproć tych dziaržaŭ, jakija buduć zbrojna napadać na inšyja dziaržawy abo narody.

Woś-ža, kali Italija napała z kulamiotami, tankami i trujliwymi hazami na słaba azbrojenuju Abisyniju i pačała tam u Afrycy padbiwać pad swajo ŭładańnie tamašnija narody, Liha Narodaŭ, ad imia zarhanizawanych eŭrapejskich dziaržaŭ, asudziła tady Italiju, pryznajučy apošniuju staranoj napadajučaj, a Abisyniju staranoj abaronnaj i pastanawiła zastasawać adnosna Italii sankcyi. Niekatoryja dziaržawy pasłuchali Lihi i zastasawali sankcyi, jakija palahali na tym, kab nie pradawać dla Italii takich matarjałaŭ i tawaraŭ, jakija jšli-b na patreby wajny. Ale heta dla Italii ničuć nie paškodziła zaniać kala paławiny Abisynii, ale mahło-b paškodzić italijancam u Abisynii zahaspadarawacca, kab hetyja sankcyi praciahnulisia daŭžej. Dziela hetaha italijanski ŭrad zahawaryŭ dyplomatyčna, što hatoŭ trymacca miru ŭ Eŭropie, ale za heta patrebawaŭ źniaćcia zastasawanych sankcyjaŭ... pryznańnia zawajawanaj Abisynii italijanskaj krainaj. Na heta eŭrapejskija dziaržawy adhuknulisia supolnaj zhodaj i ŭžo pastanawili sankcyi spynić, choć aficyjalna i nie zhadžajučysia pryznać dla Italii ŭłasnaściaj zawajowanuju Abisyniju.

A biedny negus negesti (car caroŭ) Abisynii, jaki, jak dzicia, pawieryŭ swoj los eŭrapejskaj sprawiadliwaści, asabliwa anhielskaj, jašče i ciapier abiwaje parohi eŭrapejskich wialmožaŭ, spadziajučysia, što jany jamu pamohuć wiarnuć abisynskuju dziaržawu, jakaja pratrywała 2500 hadoŭ, a ciapier jaje paniawoliŭ italijanski fašyzm.

Pry hetym treba adznačyć, što tolki Kitaj nie zhadžajecca spyniać sankcyjaŭ prociŭ Italii i maje tasawać ich dalej.

Paśla likwidacyi ŭ Eŭropie abisynskaj sprawy, jakaja mocna pahražała wajnoj Anhlii z Italijaj, treba spadziawacca nowych pierahrupowak dziaržaŭ i nowych palityčnych kirunkaŭ ŭ mižnarodnaj palitycy.

U Abisynii

Italijanskaja akupacyja Abisynii dawoli ahraničanaja. Bolšaja čaść tamašnich prawincyjaŭ abisynskaj terytoryi jašče italijancam nie paddałasia i nie paddajecca. Italijanskaje wojska nie starajecca zajmać niezaniataj terytoryi i ŭsie siły natužwaje, kab utrymać zachoplenyja prawincyi, dzie abisyncy buntujucca i nia chočać pryznać nad saboju italijanskaj ŭłady. U Addis-Abebie kožnuju noč adbywajucca pierastrełki; žychary miesta paŭciakali i pryłučylisia da abisynskaj armii, jakaja jašče nia zusim raźbita; italijanskija kalanisty miajscowymi ludźmi steroryzawanyja i bajacca bracca za haspadarku. Italijanskaje wojska musić abiaśpiačać swaich kalanistaŭ.

U Abisynii, na niezaniataj italijancami terytoryi isnuje i dzieić niezaležny abisynski ŭrad, jaki jašče maje namier prahnać z swajho kraju akupantaŭ i ŭstanawić wa ŭsiej Abisynii swaje paradki.

Bandycki napad pad pawadyrstwam endeckaha dziejača

Unočy 23 h. m. dakanany bandycki napad u Myślenicach, kala Krakawa, na pamieškańnie tamašniaha pawietawaha starasty, na pastarunak palicyi i na dźwie kramy. U starasty zrabawali na 1.500 zł. roznych pradmietaŭ: na pastarunku palicyi niewia- [redacted] likuju sumu hrošaj i 2 strelby i abrabawali dźwie kramy ŭ mieście.

Śledztwa ŭstanawiła, što napad hety dakanany pad pawadyrstwam niejkaha Dobašynskaha, staršyni pawietawaj endeckaj arhanizacyi ŭ Krakawie i što Dobašynski heny napad zarhanizawaŭ z siabroŭ endeckaj partyi, paśla narady ŭ swaim dware Chorowice, adkul na čale sotni ludziej wyjšaŭ i dakanaŭ napadu. Paśla napadu Dobašynski razam z inšymi skryŭsia u lesie, ale palicyja napaśnikaŭ akružyła i wyławiła.

U Palestynie zabureńnie nia spyniajecca

Baraćba arabaŭ z žydami ŭ Palestynie što-raz prymaje hraźniejšyja raźmiery. Araby da taho ŭzburylisia, što pačali ŭžo wystupać abresyŭna i prociŭ anhielskaj tam ułady.

Prysud śmierci ŭ Wilni

Prytycki, jaki 27.I siol. stralaŭ u Akružnym Sudzie, zasudžany na śmierć.

U Wilenskim Akružnym Sudzie 20 h. m. adbyłasia rasprawa nad Siarhiejem Prytyckim, jaki 27.I siol. u hetym-ža sudzie, padčas sudu nad kamunistymi, stralaŭ u J. Strelčuka, katory wystupaŭ świedkaj ŭ toj sprawie, a paśla, ŭciakajučy, stralaŭ u St. Dajnoŭskaha — funkcyjanera śledčaj palicyi

U wyniku rasprawy Sud zasudziŭ Siarhieja Prytyckaha, 23 hadawoha, z w. Harkawičy, Sakolskaha paw. za prynaležnaść da KPZB na 15 hadoŭ katarhi, a za zamach na žyćcio Strelčuka i Dajnoŭskaha — na karu śmierci praz pawiešańnie. Adwakat Prytyckaha padaŭ apelacyju.

Кніжка 3-я (7) „Калосься," беларускага літаратурна-навуковага часапісу ўжо друкуецца і выйдзе ў сьвет у палавіне месяца ліпня. Літаратурныя і навуковыя матарыялы — адпавядаючыя характару і вышыні часапісу — прысланыя да 1-га ліпня і ня зьмешчаны ў гэтай кніжцы будуць памагчымасьці зьмешчаны ў наступных кніжках.

Адрас: рэд. і адміністрацыя „Калосься" — Вільня, Завальная 1—2. Прысылайце на часапіс складкі! Складкі ў год — 2 зл., на асобную кніжку — 50 гр.

БЕЛАРУСЫ! Прысылайце ахвяры на фонд беларускай асьветы! — Пашырайце беларускае друкаванае слова. — Навучайце дзяцей чытаць і пісаць пабеларуску!

сталася, то сталася. А можа нават і вяртаць ня трэба было-б?

П я т р у с ь — Калі нельга вярнуць мінулага, то можна заўсёды зьвярнуць у другі бок з таго месца, куды ўжо дайшлі. Дык зьвярні! Вярніся да вёскі, калі мучае места. Вярніся да мяне, калі мучае мінулае, або клікні мяне і я пайду ўсюды за табой, пайду пакорны, паслухмяны і шчасьлівы!

В е р а ч к а — Не, Пятрусь, быць тваей— не магу! Даруй, я не змагу зрабіць цябе шчасьлівым, мінулае заўсёды будзе стаяць між намі. І не асабістага шчасьця шукаю я цяпер у жыцьці.

П я т р у с ь — А чаго?

В е р а ч к а — Ня пытай, Пятрусь! Мая сьцежка пайшла другой каляінай. „Лёгкі хлеб" сямейна-мяшчанскага жыцьця мне адасьніўся! Падругое, абавязкі маткі і жонкі накладаюць іншыя абавязкі, у якіх, як у дрыгве, топіцца душа жанчыны.

П я т р у с ь — Так... Запраўды, ты стала зусім іншай. Ты перарадзілася, Вера!

В е р а ч к а — Не, я толькі пачала вучыцца думаць і шукаць сэнсу і мэты жыцьця, між парадоксаў людзкога ладу і адносін.

П я т р у с ь — І знайшла?

В е р а ч к а — Калі і не знайшла яшчэ, то ўсё-ж веру, што знайду.

П я т р у с ь — Можна даведацца ў чым?

В е р а ч к а — У службе тэй, ці іншай, ідэі, на агульную карысьць людзкасьці.

П я т р у с ь — А ці гэта зусім не магчыма злучыць з асабістым шчасьцем?

В е р а ч к а — Ня ведаю, Пятрусь, што ты разумееш пад асабістым шчасьцем?

П я т р у с ь — Ну хоць-бы каханьне і сямейнае жыцьцё.

В е р а ч к а — Другім гэта пэўна-ж можна, але ня мне, Пятрусь.

П я т р у с ь — Чаму, Вера?

В е р а ч к а — Дзеля таго, што я перажыла маё „сямейнае шчасьце," ад якога засталося шмат горкага нясмаку і зьняверра.

П я т р у с ь — Ты ўсьцяж кахаеш таго?

В е р а ч к а — Не. але я пакахала другое.

П я т р у с ь — Можна даведацца?

В е р а ч к а — Вялікую ідэю Адраджэньня нашага працоўнага Народу!

П я т р у с ь — Бачу, якой чыстай і вялікай вырасла твая душа! Бачу высокі ўзьлёт тваіх дум! і яшчэ больш кахаю цябе, кахаю і трачу, бо бачу наколькі ты вышэй перарасла мяне.

В е р а ч к а — Ты мылішся, Пятрусь.

П я т р у с ь — Не! Толькі мне сорамна перад табой, за мае эгаістычныя і мізэрныя імкненьні і жаданьні да асабістага шчасьця.

В е р а ч к а — Праз гэта мусіць кожны прайсьці.

П я т р у с ь — Але шчасьлівы той, хто пройдзе гэта. Не заблутаецца і не заглохне ў штодзенных людзкіх хлопатах, будзённых патрэбах!

В е р а ч к а—Так, зусім згаджаюся з табой.

П я т р у с ь — Выбач, што зноў дакучаю табе сваім пачуцьцём. Кахаю цябе шчыра і горача, і калі лёс ня хоча злучыць нас так, як я гэтага хацеў, то будзь мне таварышам — другам!

В е р а ч к а — Так, Пятрусёк! З вялікай прыемнасьцю буду табе: таварышом, сястрой і другам у нашым супольным паходзе да лепшага заўтра нашага Народу! (*падае яму руку*)

П я т р у с ь — (*сьціскаючы*) Дзякую!

Зьява 15-я.

Тыя-ж, Васіль і Мікола.

В а с і л ь — Вось і я! ды і не адзін. (*да Пятруся*) Знаёмцеся! (*Дзядзька Мікола і Пятрусь знаёмяцца*).

В е р а ч к а — (*да Д. Міколы*) Вы знаёмы з Васілём?

Д. М і к о л а — Я ўсіх хіба ў Вільні ведаю.

В а с і л ь — Я дзіўлюся, як гэта мы не спатkаліся раней з вамі, Верачка?

В е р а ч к а — Я пару разоў вас бачыла, але ўнікала спатканьня, хіба дагадываецеся чаму?

Д. М і к о л а — Я даведаўся ад Васіля, што вы, Вера Лявонаўна, спаткаліся са старым вашым добрым знаёмым аднавяскоўцам дык, не сьцярпеў і прыбег пазнаёміцца.

В е р а ч к а — Шчыра дзякую, дзядзька Мікола.

Д. М і к о л а — Па дарозе мне Васіль расказаў тое-сёе, дык як, Лявонаўна, можа віншаваць?

В е р а ч к а — Але, віншуйце, я адшукала яшчэ аднаго добрага таварыша і працаўніка нашай агульнай справы.

Д. М і к о л а — Ура! Значыць небясьпека мінула? а прызнацца я крыху баяўся за вас.

В е р а ч к а — Гэтага я вам не дарую!

В а с і л ь — Але сядайце! Што-ж мы стаім, як на парадзе.

Д. М і к о л а — А я забыўся самага галоўнага: нашы стараньні ўдаліся і вы, Вера Лявонаўна, атрымліваеце пасаду беларускай вучылькі ў вёсцы Забарожжа Д. павету.

П я т р у с ь — Гэта-ж у нашай ваколіцы! Вось будуць рады твае бацькі, Верачка!

В е р а ч к а — Ах! Галава кружыцца! ад страху і радасьці. Як-жа вам дзякаваць, дзядзька Мікола? Які вы добры!

Д. М і к о л а — Але!... Асабліва, калі бачу адчыненую бутэльку на стале і такую прыемную кумпанію!

В а с і л ь — Засталося адно, выпіць за памысную працу Веры Лявонаўны на новым шляху (*налівае чаркі*).

Д. М і к о л а—(*бяручыся за чарку*) І за нашае хуткае ўсіх спатканьне у вёсцы! (*п'юць*).

В а с і л ь — А цяпер, калі ласка, усе да мяне! Вось будзе рада Ганулька!

Таболы, 1931 *Заслона.*

Roznyja wiestki

Z UKRAINSKAHA ŽYĆCIA.

Bomba pad kryžam. 17 červienia sioleta ŭ Najwyšejšym Sudzie ŭ Waršawie adbyłasia kasacyjnaja sudowaja rasprawa nad 12 ukraincami, zasudžanymi akružnym sudom u Stryi na karu ad 5 da 8 hadoŭ wastrohu, abwinawačanymi ŭ nastupnaj sprawie:

Kožny hod u dni wykanańnia śmiarotnaha prysudu na siabroch OUN (Arhanizacyi Ukrainskich Nacyjanalistaŭ) Wasila Biłasa i Dzimitra Danyłyšyna na miescy, dzie ich złoŭlena ŭ wioscy Wieryni, niawiedamyja asoby stawili kryžy z antydziaržaŭnymi napisami. Kryžy hetyja zaraz-ža zabirała palicyja. U 1934 hodzie padčas, kali adzin sielanin na zahad palicyi wykopywaŭ adzin z padobnych kryžoŭ, raptam pad im wybuchła bomba, zabiwajučy henaha sielanina na śmierć. U suwiezi z hetym palicyja aryštawała tady 12 ukraincaŭ, abwinawačanych u henaj sprawie.

Najwyšejšy Sud zaćwierdziŭ prysud akružnoha sudu ŭ Stryi nad henymi ukraincami.

Nie chacieŭ adpraŭlać panichidy biez dazwołu starastwy. Ukrainskaja hazeta „Batkiwšina" ŭ Nr 23 z 21.VI siol. padaje wiestku, što ŭ Ostrozi na Wałyni prawasłaŭny świaščeńnik a. prat. Rafalski admowiŭsia adprawić panichidu na mahile zasłužanaha wałynskaha hramadzianina i piśmieńnika M. S. Šuhajeŭskaha, pamioršaha ŭ Ostrozi 10 hadoŭ tamu. A. Rafalski žadaŭ na hetuju panichidu dazwołu ad starastwy. Ukancy jon zhadziŭsia adprawić panichidu biez takoha dazwołu, tady, kali na hetaj panichidzie budzie jon, psałomščyk i tolki 1 asoba z radni ci pryjacielaŭ pakojnika.

Dalej hena hazeta ŭ hetaj sprawie piša hetak: „kali heta była samawola a. Rafalskaha, to tady treba, kab miascowaja ostrožskaja prawasłaŭnaja hramada wyjaśniła hetu sprawu ŭ carkoŭnych uładaŭ. Kali-ž takoje damahańnie stawić zapraŭdy miascowaja administracyjnaja ŭłada, to tady z takim niačuwanym nidzie na świecie damahańniem ostrožskaje hramadzianstwa pawinna pawiaści jaknajrašučajšuju baraćbu, wykarystoŭwajučy ŭsie zakonnyja mahčymaści."

Z POLŠČY

Supakoj na palityčnym froncie. Hazety pišuć, što prezydent Rečypaspalitaj wyjechaŭ u Krynicu na daŭžejšy čas, dziela hetaha i z pryčyny adpačynkowaha času dla ministraŭ uradu, u palityčnym žyćci Polščy časowa patrywaje supakoj.

Žmiena zakonu ab pahraničnaj pałasie. Dnia 17 červienia Sojm zaćwierdziŭ źmienu Rasparadžeńnia Prezydenta Rečypaspalitaj z 23 śniežnia 1927 hodu ab hranicach dziaržawy. Nowy zakon daje pradusim šyrokuju ŭładu ministru ŭnutranych spraŭ u narmawańni adnosinaŭ na hranicach polskaj dziaržawy. Hałoŭnyja źmieny, jakija ŭwodzić nowy zakon, nastupnyja:

1) Wajawoda, abo delehawany wajawodaju pawiatowy starasta, moža zabaranić žyć i prabywać paadzinokim asobam na prastory nadhraničnaj strefy (ad 2 da 6 klm. ad hranicy) na akreśleny čas, abo na zaŭsiody, kali hetaha wymahajuć biaśpiečnaść i acharona hranicy. (Dadatak da art. 6).

2) Ministar unutranych spraŭ moža, kali biaśpieka dziaržawy abo acharona hranic hetaha wymahajuć, wydać na cełym prastory hraničnaj pałasy, abo na jaje častcy, polskim hramadzianam i polskim praŭnym asobam zabaronu nabywać niaruchomuju majemaść na padstawie aktu miž žywymi, abo na wypadak śmierci, takuju majemaść addawać u arendu abo karystacca, biez papiaredniaha dazwołu wajawody (art. 12-a).

3) Ministar unutranych spraŭ moža, kali biaśpieka dziaržawy i acharona hranic hetaha wymahajuć, zabaranić polskim hramadzianam, abo polskim praŭnym asobam wiaści handal i promysł, abo kirawać rabotami i pradpryjemstwami biez papiaredniaha dazwołu wajawody (art. 12-a).

4) U hraničnaj pałasie moža wajawoda zabaranić zatrudniać paadzinokija asoby ŭ handli i pramysłowych pradpryjemstwach i hetaje samaje prawa maje instytucyja publičnaj užytačnaści z uzhladaŭ publičnaj biaśpieki abo acharony hranic. (art. 12-b).

5) Wajawoda moža spynić abo zabaranić dziejnaść kožnaha tawarystwa, sajuzu, ci kooperatywy, abo ich addziełaŭ, na prastory hraničnaj pałasy, kali pryznaje, što takaja dziejnaść nia jość pažadana z uzhladaŭ biaśpieki, abo acharony hranic dziaržawy. (art. 12-h).

Takim wialikim ahraničeńniam moža, jak bačym, padlahać žyćcio adzinki i cełaha hramadzianstwa ŭ hraničnaj pałasie. Da hetaha treba dadać, što ŭsie rasparadžeńni ŭłady ŭ henych sprawach, nia wymahajuć nijakaha abasnawańnia i što ad ich niama ni apelacyi i skarhi da Najwyšejšaha Administracyjnaha Trybunału.

Z ZAHRANICY

15 miljonaŭ ekzemplaraŭ sawieckaj kanstytucyi. Polskaja Telehrafičnaja Ahiencyja padaje, što centralny wykanaŭčy kamitet kampartyi SSSR zahadaŭ wydrukawać 15 miljonaŭ ekzemplaraŭ prajektu nowaj kanstytucyi.

Raźwiazańnie prawych arhanizacyjaŭ u Francyi. Paśla pieramohi „Narodnaha Frontu" u Francyi utwaryŭsia lewy ŭrad Bluma, jaki rašuča prystupiŭ da likwidacyi prawych arhanizacyjaŭ i dziela hetaha wydaŭ niedaŭna dekret ab raźwiazańni henych arhanizacyjaŭ. Spačatku farmalna i pazorna raźwiazańnie prawych partyjaŭ adbyłosia spakojna. Wyklikała jano adnak wialikaje niezadawoleńnie siarod šyrokich masaŭ i ciapier štoraz pawialičwajucca z hetaj pryčyny pawažnyja zabureńni i demanstracyi u roznych miascoch Francyi suproć „Narodnaha Frontu" i sučasnaha lewaha ŭradu.

Pažar u Šarkaŭščynie. Unačy z 24 na 25 červienia siol. u miastečku Šarkaŭščynie wybuch wialiki pažar, u časie jakoha zhareła 143 budynki, z hetaha 55 pamieškalnych damoŭ i 88 haspadarčych budynkaŭ, mnoha haspadarčych pryładaŭ i žywioły. 2 asoby aparylisia padčas pažaru. Ahułam pažar narabiŭ wialikich stratаŭ, pazbawiŭ jon strachi nad hałowoj i pažywy kala 100 siemjaŭ.

Piśmy z wioski

Chłopcy, wučemsia sapraŭdnaj kultury.

(Z padarožžy pa Wałožynskim pawiecie).

Jeździačy pa našych, biełaruskich siołach, usiaho ja bačyŭ — i dadatniaje i adjemnaje. Źwiarnu tut uwahu na hałoŭnaje adjemnaje, heta na falsyfikat kultury i fałšywaje paniaćcie kulturnaści.

Pa našych siołach wielmi časta haworycca ab kulturnaści, ale nie dakładna ab hetym sialanam tłumačać. Mała świedamaja sialanskaja moładź, nie razumiejučy ŭ čym maje zaklučacca hetaja kulturnaść, bywaje biarecca da jaje zusim z inšaha boku. Mnohija razumiejuć, što adziecca ŭ kramninu budzie kulturniej, a ŭ wopratcy swajej raboty zusim nia kulturna. Ciapier pajšli ŭ modu ćwiordyja kaŭnieryki i heta tak-ža maje być bolš kulturna, jak u zwyčajnaj kašuli i h. d. Ale-ž sapraŭdy tak nia jość, jak dumajuć mnohija našyja chłopcy. Bo što z taho, što adzienieš kramnuju marynarku, abo i cełу kramny kaścium, dy ŭzłožyš ćwiorda wyprasawany kaŭnieryk, ale nia ŭmieješ paludzku abychodzicca z druhimi i nia ŭmiaješ šanawać swajej sapraŭdnaj kultury. Dziela praktyki radžu padsłuchać, jak sabraŭšysia hetkija krywyja kulturniki zachoŭwajucca i ab čym i jak jany haworać. A jany bywajuć usie ŭ kramnych kaściumach i ćwiordych kaŭnierykach. I što-ž jany robiać? — Papichajucca, papolsku klanucca i łajucca, topčuć adny druhim nohi i z hetaha ŭsie razam śmiajucca.

Darahaja moładź, padumaj nad hetym dobra. Zrazumiejma, što my ciapier pieražywajem 20-ty wiek, i što ciapier kultura lezie ŭ kožnuju chatu nia tolki praz dźwiery, ale i praz wokny. Adna biada, što my nia ŭmiejem prymać hetaj kultury i nie zważajučy na toje, što ŭbirajemsia, jak kulturnyja ludzi, ale nia ŭmiejem kulturna žyć. Kultura imienna kaža pastupać usiudy kulturna — šanawać starejšych, šanawać adny druhich, pastupać česna, być akuratnym, być wietliwym siarod swaich i siarod čužych. Zamiest na wulicy papichacca, abo stroić pustyja śmiechi, kryčać i adny z druhimi bicca, my pawinny hurtawacca ŭ adno miesca i čytać hazety abo knižki, arhanizawać amatarskija pradstaŭleńni, piajać choram swaje pieśni i ahułam arhanizawana pracawać dziela samaadukacyi.

Kali našaja moładź zrazumieje, što sapraŭdnaj jość kulturaj i na čym sapraŭdnaja kultura palahaje, i stanie žyć tak, kab zasłužyć sabie imia kulturnych ludziej, to takaja moładź budzie ščaśliwaja.

Dyk da pracy, darahija braty, ŭsie, jak adzin, waźmiemsia za rodnuju hazetu i knižku dy pačniom arhanizawacca i zakładać biblijateki-čytalni, amatarskija teatry i chory!

Biarem mołat praświety i mur ciemry razwalim!

Padarožny.

Za lepšy byt sialanstwa.

(Z Lidzkaha paw.).

Ciapierašni haspadarčy kryzys niazwyčajna ciažka ŭzloh na sialanstwa i swaim ciažaram wyciskaje piačać biady-hora ŭ našych wioskach. Nie zważajučy na toje, što sielanin źjaŭlajecca praducentam hałoŭnych i najbolš nieabchodnych praduktaŭ, jon najbolš ciarpić ad hetaha haspadarčaha kryzysu, jon nia maje mahčymaści rabić upływaŭ na chod padziejaŭ i nia moža dabicca palepšańnia swajho mataryjalnaha pałažeńnia.

Čamu heta tak? — A heta tamu, što sialanstwa najmienš arhanizawanaje.

Hlańma na pramysłoŭcaŭ i handlaroŭ. Jany abjednywajucca ŭ sajuzy i hetak arhanizawana baroniać swaje intaresy. Jany kalkulujuć ceny tawaraŭ i nichto z ich nie pradaje nižej ustanoŭlenaj cany.

A jak staić sprawa z pradažaj sialanskich praduktaŭ? Moža sialanie taksama kalkulujuć i abličajuć wartaść swaich praduktaŭ, a hetak ustanawiŭšy canu, tak i pradajuć na rynku? — Ničoha padobnaha! Sielanin, wywoziačy swaje pradukty na rynak, zwyčajna, nia wiedaje cany swajho praduktu. Za jaho kalkulujuć i ŭstanaŭliwajuć ceny tyja, što skupliwajuć jaho pradukty. U takich warunkach sielanin, choćki-niachoćki, pradaje swaje pradukty pa takoj canie, jakuju skupščyki dajuć.

Woś-ža wychad z takoha nienarmalnaha pałažeńnia mahčymy tolki praz swaju arhanizacyju.

Kab stwaryć u sialanstwie patrebnuju siłu dziela arhanizacyjnaj pracy, kab stwaryć lepšy byt u wioscy, treba ŭsimi siłami imknucca da taho, kab u kožnaj wioscy była swaja biblijateka-čytalnia, a tak-ža i swaja arhanizacyja. U takich arhanizacyjach i praz knižku pašyrycca i pahłybicca haspadarčaja wieda i budzie hadawacca instynkt hramadzkaści—supolnaści, dziela abarony sobskich intaresaŭ.

Wiedajma, što kožny jość sam kawalom swajej doli, swajho ščaścia. Dziela hetaha nichto inšy, jak tolki sami sialanie pawinny dumać ab swajej doli i bracca za pierabudowu swajho žyćcia.

Markuć.

Žyćcio i nastroi.

(Z Brasłaŭskaha paw.).

Čytajučy ŭ „Biel. Krynicy" piśmy z wioski, možna krychu dawiedacca, jak žywuć biełaruskija sialanie. Widać, adnak, što karespandenty apiswajuć sialanskaje žyćcio pawiarchoŭna, bo ŭ praktycy pałažeńnie wiaskoŭcaŭ jość horšaje. Ale wiedajučy pryčyny hetkaha pawiarchoŭnaha apiswańnia biełaruskaha wiaskowaha žyćcia, arjentujuć čytača i hetkija apisańni dakładna.

Z polskaj presy my dawiedwajemsia, jak hladziać na biełaruskuju i litoŭskuju wiosku roznyja polskija „kulturtrehiery," jakija stykajucca z našym sialanstwam biespasredna i pasredna ŭ swajej dziejnaści raśsiawańnia ŭ nas polskaj kultury. Hetyja pany hladziać na naš narod, jak zusim na niakulturnych ludziej, jakich treba praświačać, pačynajučy ad „A." Taho, što naš narod maje swaju kulturu i swaju bahatuju tradycyju, jany nia bačać i bačyć nia chočać. Pry hetym treba adznačyć, što henyja „kulturtrehiery" zusim nia znajuć tak-ža i socyjalnaha pałažeńnia našaha narodu, nia znajuć nawat gieografična-klimatyčnych warunkaŭ našaha Kraju. Adnak, jany adważna i „aŭtorytatyŭna" pawučajuć našych praktyčnych sialan, jak haspadaryć, što, kali i jak rabić i kudy kirawać swaje dumki nadziei lepšaj budučyni

Dyk i nia dziwa, što na wioscy panujuć takija nastroi, jakija pakazwajucca hetak strašnymi panom „kulturtrehieram." A nastroi hetyja našyja wiaskoŭcy wyjaŭlajuć wialikim zacikaŭleńniem sučasnymi palityčnymi mižnarodnymi padziejami i socyjalna-hramadzkimi ruchami. Pry hetym, sialanie wyrazna wykazwajucca praciŭ ucisku silniejšymi słabiejšych i stajać za ŭsio swajo rodnaje, a tak-ža damahajucca ziamielnaj reformy. Usiakija palityčnyja ŭzdymy našych sialan ničuć nia pužajuć, ale naadwarot — abnadziejwajuć. Hetkija ciapier nastroi ŭ wioscy.

Nie zabywajmasia, braty Biełarusy, što nielha žyć adnej nadziejaj, ale treba i pracawać nad saboj — treba praświačacca, kab bolš paznać sens žyćcia i nawučycca praduktyŭniej pracawać.

Janka Padawałko.

Strajk.

Barancy, Wialejskaha paw. Byŭ i ŭ nas strajk. Našyja chłopcy skarystali z prawa strajku, ale nia ŭsie byli salidarnyja i nia ŭmieli razumna pakirawacca. Było heta nie ciapier, ale i nia nadta daŭno—sioleta wiasnoj.

U dware Teklinapoli šmat piaskoŭ. Na piaskoch raźwiali łazu. Sioleta wiasnoj pačali hetuju łazu rezać na košyki. Ludzi na hetuju rabotu byli paklikany z troch wiosak. Rabić treba było ad 6 hadziny ranicy da zachodu sonca, płacili pa 80 hr. za hetki wialiki dzień pracy. Rabotniki hetak rabić nie chacieli i ŭsie ad pracy adyjšli. Na zaŭtra dabawili zapłatu — pa 90 hr. za dzień pracy. Ale rabotniki nie zhadzilisia i da pracy nie pajšli. Na treci dzień dali pa 1 zł. za dzień pracy i rabočy dzień abaznačyli ad 7 hadziny ranicy da 6 hadziny wiečara. Na zapłatu rabotniki zhadzilisia, ale jašče damahalisia skaračeńnia dnia pracy — ad 7 rana da 4 papaŭdni. Tut rabotniki „załamalisia" i strajku da kanca nie dawiali — chłopcy adnaje wioski zhadzilisia pracawać ad 7 rana da 6 wiečara. Tady strajkujučych rabotnikaŭ za swaje prawy ŭžo rezać łazu nie pryniali, bo ŭzialisia da pracy „strajkałomy". Hetak i končyŭsia naš wiaskowy strajk. B. M.

Z Biełastoččyny.

U niewialičkim miastečku Charoščy i to našaje žyćcio rozna placiecca. Tut naš špital uwa ŭsim trymaje pieršuju skrypku. Zdajecca ludziam, što-ž špital, dy jašče dla warjataŭ! A hladzi, jaki tam ścisła polski ŭwa ŭsim paradak! Jość stralcy i stralčychi. A jak chto ŭ palitycy krychu inakš dumaje, dyk tudy na rabotu nia nadta pojdzie. Špitalny ŭ nas duch—heta čysta proŭradowy duch. Hatoŭ jon zmahacca da apošniaha, kab nikomu i ani ŭ čym swajho nie ŭstupić.

Kaścioł u nas, dyk wiedama, jak i ŭsiudy, z nacyjanalnaha swajho hruntu i dalej nia schodzie. Ale biełarusy ŭ Charoščy, dyk taksama ćwiordyja! Jany tolki čuchajuć swaje hałowy i sami sabie ŭśmichajucca. Biełarusy mocnyja ŭ Charoščy, ich łamali ŭžo carskija čynoŭki i akazałasia, što neprasna. Ciapier spatkalisia jany z inšymi čynoŭnikami. I palicyja ŭ Charoščy nia śpić, ale swajo robie. U nas kury nadta kraduć, i palicyja nia moža henych złodziejaŭ nijak wyławić.

B.

Redaktar Jan Paźniak. Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny ŭ Wilni, Zawalnaja 1 — 2. Wydawiec A. Šutowič